УДК 821.161.3 «1920/1930»

**І. У. Каляда**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# ТЭАТРАЛЬНЫЯ ДЫСКУСІІ 1920-Х – 1930-Х ГГ.: СТАНАЎЛЕННЕ ТЭАТРАЛЬНАГА ПРАФЕСІЯНАЛІЗМУ

У артыкуле разглядаюцца пытанні станаўлення і развіцця беларускага тэатра ў 1920-я – 1930-я гады ў рэчышчы правядзення агульнадзяржаўнай праграмы нацыянальна-культурнага будаўніцтва – беларусізацыі. Гэты працэс актыўна суправаджаўся тэатральнымі дыскусіямі, у ходзе якіх вялося грамадскае абмеркаванне праблем тэатральнага мастацтва, дзейнасці тэатральных калектываў. Востра ставілася пытанне аб неабходнасці стварэння нацыянальнай тэатральнай школы. Усё гэта садзейнічала ўздыму ў развіцці беларускага тэатра, які, на жаль, быў нядоўгі. Ужо ў канцы 1920-х гг. назіраецца пагаршэнне сітуацыі, націск на літаратуру і тэатр з мэтай іх "пралетарызацыі" і ліквідацыі вынікаў нацыянальнага адраджэння.

**Ключавыя словы:** нацыянальная культура, палітыка беларусізацыі, тэатральнае мастацтва, тэатральныя дыскусіі, мастацкія плыні, беларускі тэатр.

**I. U. Kolyada**
Belarusian State Technological University

# THE THEATRICAL DEBATE OF THE 1920S AND 1930S: FORMATION OF THEATRICAL PROFESSIONALISM

In the article the questions of formation and development of Belarusian theatre in the 1920-ies – 1930-ies in the framework of the national program of national-cultural construction, Belarusization. This process is accompanied by a theatrical debate, in which conducted public discussion of the problems of theatre arts activities theatre groups. Sharply raised the question about necessity of creation of the national theatre school. All this contributed to the rise in the development of the Belarusian theater, which, unfortunately, was short-lived. At the end of the 1920s. observed the deteriorating situation, the pressure on literature and theater for their "proletarianization" and the elimination of the results of national revival.

**Key words:** national culture, the policy of Belarusization, theater, theatre, debate, art direction, the Belarusian theatre.

**Уводзіны.** Пра тэатральныя дыскусіі, якія праходзілі ў 1920-я – 1930-я гады, шмат пісалі, аднак мала што было вядома канкрэтна.

Тэатральныя дыскусіі – гэта публічныя абмеркаванні практычных і тэарэтычных праблем тэатральнага мастацтва і драматургіі, адна з форм тэатральнага жыцця, дзейнасці тэатральных калектываў. У больш вузкім значэнні – абвастрэнне тэатральных спрэчак, сутыкненне розных пунктаў погляду на гісторыю, сучасны стан і перспектыву развіцця тэатра. Асаблівае значэнне і вастрыню тэатральныя дыскусіі набываюць у перыяды станаўлення тэатральнага прафесіяналізму (на Беларусі – у 1920-я гады), узнікнення новых мастацкіх плыняў.

**Асноўная частка.** Тэатральныя спрэчкі 1920-х гадоў зводзіліся да наступнага: стварэнне самабытнага сцэнічнага мастацтва, нацыянальнай тэатральнай школы ці ператварэнне тэатральнага мастацтва ў школу "пралетарскага" выхавання і ў трыбуну для пашырэння сацыялістычных ідэй.

Тэатральныя дыскусіі пачатку 1920-х гадоў вяліся на старонках газеты "Савецкая Беларусь". І першым крокам стаў артыкул Кукса (псеўданім) "Аб сучасным беларускім тэатры" [1], дзе ён крытыкаваў Наркамасвет БССР за тое, што ён не турбуецца аб тым, каб тэатр развіваўся шляхам сапраўднага беларускага народнага мастацтва. Таму "лепшы беларускі рэпертуар у загоне, а іграюць пераклады, і ў прыдатку слабейшыя" [1].

У далейшым Янка Святляк у артыкуле "Аб святкаванні Купалля" прапанаваў выкарыстаць беларускі тэатральны рэпертуар для адраджэння традыцыйных народных свят і абрадаў, якія, у сваю чаргу, будуць садзейнічаць станаўленню беларускай тэатральнай школы [2]. У шэрагу артыкулаў Я. Святляка і Р. Судніка звярталася ўвага на з'яўленне ў вёсках і мястэчках шматлікіх аматарскіх гурткоў, якія жывяць беларускі тэатр. Але і ў іх адзначаліся хібы (напрыклад, ігралі сялян у галіфэ і высокіх шнураваных ботах).

Цэнтральнымі праблемамі тэатральных дыскусій 1920-х гадоў былі рэпертуар і нацыянальны стыль. Так, у артыкуле "Тэатр на Беларусі" З. Жылуновіч (пад псеўданімам

С. Смык) звярнуў увагу на тое, што ў беларускіх гарадах, як і да рэвалюцыі, пануе расійскі тэатр, а публіка ў ім – новая, савецкая буржуазія і дзялкі-спекулянты. Між тым у сялянскай Беларусі іншыя ўмовы, чым у расійскай сталіцы, "і падысці з маскоўскаю меркаю да тэатральнай справы ў Беларусі – гэта значыць… адсекчы яму (беларускаму тэатру) ногі", якія, лічыў аўтар, моцна стаяць толькі на вясковай, сялянскай глебе [3].

Выказваліся і іншыя меркаванні, згодна з якімі галоўнае ў тэатральнай працы – гэта прафесіяналізм, а ў крытыцы – аб'ектыўнасць.

З'яўленне крытычных выступленняў у адрас Вандроўнага тэатра, абвінавачванняў у недастатковым прафесіяналізме вымусіла ўтэатральныя дыскусіі ўступіць і У. Галубка. Ён пісаў пра нежаданне выдавецтваў публікаваць беларускія п'есы, а таксама няўвагу сталічных рэжысёраў да нацыянальнага рэпертуару.

Паяднаў гэтыя крайнія погляды З. Бядуля ў сваіх шматлікіх артыкулах па праблемах тэатра, дзе ён абгрунтаваў думку, што тэатр павінен быць народным па сваіх крыніцах, нацыянальным па стылі і прафесійным па мастацкім узроўні. І першай спробай такога сінтэзу ён лічыў драму М. Чарота "На Купалле", пастаўленую ў БДТ, у якую прыгожа "ўпісваліся" харэаграфія, музыка і сцэнаграфія. Яшчэ больш, выказвалася думка, што гэтая музычная драма пачала новую эпоху ў гісторыі развіцця беларускага тэатра.

Тэатральныя дыскусіі першай паловы 1920-х гг. скончыліся грамадскім абмеркаваннем дзейнасці мінскіх тэатраў у форме "суда над тэатрамі", вельмі папулярнага ў той час: на "лаўцы падсудных" сядзелі кіраўнікі Беларускага, Рускага і Яўрэйскага тэатраў. Пасля выступленняў "пракурораў" і "абаронцаў" быў вынесены прысуд: "Прымаючы пад увагу тое, што тэатр з'яўляецца магутнай зброяй у руках пралетарыята, суд прызнае што мінскія тэатры не ўсё рабілі для гэтага, і прызнае вінаватымі ў тым, што яны не шукалі шляхоў новай творчасці, а таксама не мелі сувязі з працоўнымі масамі" [4].

Як гэта не дзіўна, але такое абмеркаванне спрыяла папулярызацыі тэатральнага мастацтва, якое ў 1923–1926 гг. знаходзілася на ўздыме. Тэатральная крытыка адзначала поспех у БДТ пастановак п'ес Е. Міровіча "Кастусь Каліноўскі", "Машэка", "Каваль-ваявода", "Кар'ера таварыша Брызгаліна", у Беларускай драматычнай студыі ў Маскве – народнай драмы "Цар Максімілян", папулярнасць на вёсцы тэатра У. Галубка.

У 1925 г. выходзіў часопіс "Трыбуна мастацтва", які ставіў мэту распрацаваць пытанні беларускага тэатра і музыкі, беларускага нацыянальнага стылю. Акрамя таго, ставілася задача – стварыць самабытную беларускую оперу ў жанры музычнай драмы.

На жаль, такія спрыяльныя ўмовы для станаўлення беларускага тэатра праіснавалі нядоўга.

Ужо у 1927–1930-я гг. сітуацыя ў тэатральным мастацтве пагоршылася катастрафічна. Як вядома, гэта перыяд, калі адначасова з рэалізацыяй праграмы індустрыялізацыі і калектывізацыі, згортваннем беларусізацыі адбываўся наступ на літаратуру і тэатр з мэтай іх канчатковай "пралетарызацыі" і ліквідацыі вынікаў нацыянальнага адраджэння.

Распачала гэтую кампанію газета "Звязда" (орган ЦК КП(б)Б), якая падтрымала погляды тагачаснага першага сакратара ЦК КП(б)Б В. Кнорына аб тым, што да Кастрычніцкай рэвалюцыі Беларусі як самастойнай дзяржаўнай адзінкі не было, а яе першы дзяржаўны тэатр вырас у рэчышчы рэвалюцыі.

У той жа "Звяздзе" 23 жніўня 1927 г. з'яляецца артыкул У. Ліліна "На тэатральным фронце", дзе большую частку п'ес з рэпертуару БДТ-1 ён аднёс да катэгорыі "ідэалагічна бясшкодных", але адзначыў, што "ніводная з іх не імкнулася развязаць якое-небудзь вялікае пытанне сучаснасці або рэвалюцыйнага мінулага". Аўтар абвінаваціў Наркамасветы БССР у тым, што быццам бы БДТ-1 "у мінулым сезоне не паказаў ніякіх дасягненняў". У рэпертуары БДТ-2 ён назваў шэраг п'ес "непераканаўчымі" або "ідэалагічна не зусім апраўданымі" [5].

Пад націскам партыйнай крытыкі у 1927 г. з рэпертуару беларускіх тэатраў былі зняты "Тутэйшыя" Я. Купалы (галоўнай памылкай пастаноўкі гэтай п'есы стала тое, што ў яе змесце нібыта праяўляюцца нацыяналдэмакратычныя элементы) (БДТ-1) і перакладзеная ім п'еса "Эрас і Псіхея" Е. Жулаўскага, драма В. Шашалевіча "Апраметная" і нават трагедыя Еўрыпіда "Вакханкі" (БДТ-2).

У выніку такіх рэпрэсіўных мер тэатры вымушаны былі перайсці на перакладны расійскі рэпертуар "пралетарскага зместу", што, у сваю чаргу, выклікала пратэст з боку беларускай літаратурна-мастацкай грамадскасці, якая выступіла супраць нападак на беларускую школу тэатральнага мастацтва, што яшчэ толькі складвалася.

Усё гэта прывяло да абвастрэння дыскусій 1927–1929 гг. Галоўным аб'ектам ганенняў стаў БДТ-2, замежныя класічныя і нацыянальныя творы яго рэпертуару. Так, напрыклад, рэжысёр Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР Л. Літвінаў назваў "непатрэбнымі і шкоднымі" у рэпертуары БДТ-2 п'есы "Апраметная",

“Эрас і Псіхея”, “Сон у летнюю ноч” У. Шэкспіра і іншую “бажэственную і містычную” класіку, якая “павядзе толькі да адрыву ад запатрабаванняў рабочай аўдыторыі” (“Звязда”, 6 мая 1928 г.).

Адказам сталі палемічныя артыкулы Т. Глыбоцкага у газеце Савецкая Беларусь” “Калі ж запяюць верацёны?” (27 кастрычніка 1928 г.) і “Даволі анекдотаў” (11 лістапада 1928 г.), дзе ён крытыкаваў мастацкага кіраўніка БДТ-1 Е. Міровіча за яго памкненні дапасаваць беларускую тэматыку да “пралетарскай ідэалогіі”. На думку аўтара, замест таго, каб пашыраць і паглыбляць беларускае тэатральнае мастацтва, БДТ-1 выцясняе яго перакладным расійскім рэпертуарам (“Браняпоезд 14-69” У. Іванова, “Мяцеж” Д. Фурманава і інш.).

Т. Глыбоцкі таксама ставіў пытанні: чаму беларускі тэатр павінен развівацца менавіта па тых этапах, па якіх ідзе расійскі тэатр? Чаму беларускаму гледачу важней паднесці сібірскіх партызан, чым паказаць сваіх барацьбітоў? Ён прыходзіў да высновы, што няўмелы бяздушны падбор рэпертуару пазбаўляе беларускі тэатр усякай самабытнасці.

“Звязда” адказала на гэтыя выступленні публікацыяй артыкула Д. Мірончыка “Супраць палітычнай двулікасці. Да пытання аб правай небяспецы ў культурным будаўніцтве” (17 лістапада 1928 г.), які абвінаваціў Т. Глыбоцкага ў распальванні варожасці супраць Расіі і рускай культуры, а тэорыю самабытнасці беларускага тэатра аб’явіў накіраванай на падрыў адзінства Савецкага Саюза і абвастрэнне ўзаемаадносін рабочага класа з сялянствам.

На гэты грубы палітычны выпад адгукнуўся З. Жылуновіч артыкулам “Беларуская самабытнасць і безухільны інтэрнацыяналізм, ці старая прагудка на новы лад” (“Савецкая Беларусь” ад 20 лістапада 1928 г.), дзе звярнуў увагу на адзінства поглядаў прарасійскіх шавіністаў, якія лічылі інтэрнацыянальным толькі расійскі рэпертуар, а ўсё іншае – нацыяналізмам, і дарэвалюцыйных “ісцінна рускіх патрыётаў”, чарнасоценцаў, што таксама не прызнавалі беларускай нацыянальнай культуры, абвяшчалі яе “польскай інтрыгай”.

Адказ прагучаў у той жа “Звяздзе” ад таго ж Д. Мірончыка ў артыкуле “Раскрываем дужкі. Аб правай сутнасці выступленняў тав. Жылуновіча” (24 лістапада 1928 г.). Фактычна гэта стала адным з першых абвінавачанняў беларускага нацыянальнага адраджэння ў буржуазным нацыяналізме.

Тэатральная дыскусія абвастрылася, набыла палітычны характар. І ў хуткім часе афіцыйна барацьбу з “правым ухілам” у тэатральнай дыскусіі ўзначаліла кіраўніцтва КП(б)Б, якое ў шматлікіх пастановах заклікала весці “няўхільную барацьбу” з варожымі пралетарыяту і сялянскай беднаце плынямі ў літаратуры і мастацтве, рашуча прыступіць да ўтварэння нацыянальнага па форме і пралетарскага па змесце тэатральнага і кінарэпертуару, утварыць рабочую тэатральную крытыку (у якасці “крытыкаў” прапаноўваліся гледачы з рабочага класа).

На старонках газеты “Звязда” была арганізавана прапрацоўка Т. Глыбоцкага і іншых прыхільнікаў нацыянальнай самабытнасці тэатра з боку “простых тэатральных гледачоў”. Супраць тэатральных “самабытнікаў” па даручэнні партыйнага кіраўніцтва выступалі вядомыя беларускія дзеячы, якія займалі адказныя пасады (А. Баліцкі “За пралетарскі змест нацыянальнай літаратуры”, “Аб шляхах развіцця беларускага тэатра і памылках Т. Глыбоцкага”, А. Некрашэвіч “Чым гэта ўсё пахне?” і інш.).

У адрас перш за ўсё Т. Глыбоцкага, З. Жылуновіча і М. Зарэцкага гучалі нават такія абвінавачванні, як прапаганда “замшэлай, даўно выкрытай… тэорыі аб самабытнасці”, паводле якой сучасная сацыялістычная беларуская культура, літаратура і мастацтва не павінны карыстацца буржуазнай і нават феадальнай старажытнасцю, развівацца на кулацкіх “Апраметных”, на легендах і казках Афрасіній Полацкіх і Кліментаў Смаляцічаў” (“Звязда” ад 27 ліпеня 1929 г.).

**Заключэнне.** Беларускі тэатр з’яўляўся і з’яўляецца свайго роду летапісам гісторыі свайго народа, бо захоўвае спадчыну народа (вобразы, постаці гістарычных асоб, важныя моманты гістарычных падзей). Як частка мастацкай культуры тэатр у сваім развіцці адлюстроўвае ўсе складанасці гістарычнага лёсу Беларусі.

У 1930-я гг. тэатральныя дыскусіі фактычна пераўтварыліся з дыскусій у маналог бальшавіцкай крытыкі, ідэалагічную прапрацоўку дзеячаў мастацтва.

Дыскусіі аднавіліся толькіў 1960-я гады.

**Літаратура**

1. Кукс А. Аб сучасным беларускім тэатры // Савецкая Беларусь. 1921. 3 ліпеня.
2. Святляк Я. Аб святкаванні Купалля // Савецкая Беларусь. 1921. 7 ліпеня.
3. Жылуновіч З. Тэатр на Беларусі // Савецкая Беларусь. 1921. 27 ліпеня.
4. Конан У. Тэатральныя дыскусіі // Савецкая Беларусь. 1923. 6 кастрычніка.
5. Лілін А. На тэатральным фронце // Звязда. 1927. 23 жніўня.

## References


1. Kuks A. About the modern Belarusian theater. *Sovetskaya Belarus'* [Soviet Belarus], 1921, July 3. (In Belarusian).
2. Svyatlyak E. On the celebration of Ivan Kupala. *Sovetskaya Belarus'* [Soviet Belarus], 1921, July 7. (In Belarusian).
3. Zhilunovich S. Theater of Belarus. *Sovetskaya Belarus'* [Soviet Belarus], 1921, July, 27 (In Belarusian).
4. Konan U. Theater discussions. *Sovetskaya Belarus'* [Soviet Belarus], 1923, October, 6 (In Belarusian).
5. Lilin A. In front of the theater. *Zvyazda* [Zviazda], 1927. August, 23 (In Belarusian).


## Інфармацыя пра аўтара


**Каляда Іна Уладзіміраўна** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўныі тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь).


## Information about the author


**Kalyada Ina Uladzimirauna** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republik of Belarus).


*Пастуніў 10.09.2017*